ДУК “Гарадоцкі культурна-асветніцкі цэнтр і
сетка публічных бібліятэк”
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу

Літаратурны альманах з аўтарскімі паэтычнымі творамі і работамі малай прозы, прадстаўленымі на конкурс

# "Зямля, дзе ўтульна сэрцу"



Гарадок, 2019

Адказны за выпуск :                              А.В.Абрамава
Кампьютерны набор і афармленне :    І. Я. Башмакова

Падпісана да друку:   1.11.2019 г.

Кантактная інфармацыя:
г.Гарадок,
вул. Ленінская, 4
Тел.: 4-11-76

У жыцці кожнага чалавека ёсць куточак, успаміны аб якім на працягу ўсяго жыцця захоўваюцца ў сэрцы. Бяскрайнія рэкі, блакітныя азёры-люстэркі, шумныя дубровы, звонкія крыніцы — так і вабіць да сябе прыгажосць роднага краю.

Год малай радзімы – добрая нагода звярнуць увагу на родныя мясціны. І на тых, хто сваёй творчасцю, душэўнай неабыякавасцю дае гэтым месцам другое жыццё.

Гарадоцкая цэнтральная раённая бібліятэка ў рамках праекта “Зямля, дзе ўтульна сэрцу” на працягу года прымала вершы, эсэ, паданні альбо апавяданні, прысвечаныя гораду Гарадку, Гарадоцкаму раёну. Прадстаўленыя матэрыялы размяшчаліся на сайце Гарадоцкай сеткі публічных бібліятэк. Спасылкі на іх публікаваліся ў сацыяльных сетках “Одноклассники”, “ВКонтакте” для азнакамлення як мага большай колькасці карыстальнікаў. Удзельнічаць у праекце маглі жыхары горада Гарадка і Гарадоцкага раёна ўсіх узростаў.

Прадстаўляем вашай увазе творы, прадстаўленыя на конкурс.



## Аляксей Блінаў

### Дорохи

Моя деревня Дорохи,
Красивое, родное место!
Здесь братья, я, мои друзья
Счастливо прожили всё детство.
Здесь рядом озеро и лес,
А в нём – как будто великаны,
С восьмого века до сих пор
Стоят могильные курганы.

Когда-то шумною, большой,
Она жива ещё и ныне,
Хоть с сорок третьего по ней
Звонят колокола Хатыни.
И сколько б ни было с ней бед
Всегда деревня оживала,
Как больно видеть, что сейчас
Она тихонько умирает.
Так что с людьми произошло,
Чего все в город побежали?
Сюда лишь отдохнуть душой
На выходные приезжают.
Нас не могли враги сломать
Земля родная помогала
Теперь же сами, как слепцы,
Родные сёла покидаем.
О, боже правый, вразуми!
Открой глаза сердца и души,
Чтоб снова зацвели сады
И смех детей покой нарушил.

## Мамин хлеб

Из детства далёкого, будто из сна,
Осталась картина такая,
Как мама в натопленной русской печи
Хлеба для семьи выпекала.
Просеяв на сито ржаную муку,
В деже мать готовила тесто,
И ставила на ночь расти, созревать,
Чтоб вкусный был хлеб, а не пресный.
А утром для этого печь истопив,
Из топки угли выгребала.
И на деревянной лопате большой
Туда караваи сажала.
Я помню как ждали пока испечёт,
Какой аромат шёл по дому!
Нас четверо братьев, я самый меньшой,
О, как мне хотелось, малому!
Потом расстелив полотенце на стол,
Нас мама на лавку сажала.
Испёкшийся хлеб! Ароматный! Большой!
Лопатой с печи доставала.

И снова мы ждали – он должен остыть.
Но как удержаться не знали,
И мы втихаря, чтоб не видела мать,
Руками горбушку щипали.
И вот час настал, мама хлеб в руки взяв,
Ребром к животу прижимала,
И перекрестив его, острым ножом,
Нам ломтики всем нарезала.
И все мы по кружке налив молока,
Счастливые, лопали вместе.
Навечно запомнился мне этот вкус,
Вкус хлеба далёкого детства.



## Перелётные птицы

Отшумели метели и вьюги,
Отступает, сдаётся зима,
Птичьим гомоном, соком берёзы
Распахнула объятья весна.
Стаи птиц возвращаются с юга,
Обживают родные места,
По утрам на лугах снова слышен
Звонкий, радостный крик журавля.
Аист важно шагает вдоль речки,
Поджидая подругу свою,
С ней взлетев на родное гнездовье
Громким клёкотом славит весну.
А в саду, где прибиты скворешни,
Настоящая птичья война.
Там скворцы, заселяясь в свой домик
Выдворяют семью воробья.
Зря упрямится серая птаха,

Воробей послабее скворца
И чирикнув подруге: «Спасайся!»
Прочь летит из чужого гнезда.
Каждый год перелётные птицы
Покидают чужие края,
Где спасались от снега и стужи
И стремятся в родные места.
Пусть теплей и сытней в южных странах
Только птицы уверены в том,
Где гнездо, где на свет появились –
Это Родина, это их дом.

## Цена хлеба

Дождями умыта, обласкана,
И солнцем весенним согрета,
Земля – для посева созревшая
Ждёт плуга, как друга невеста.
Всем миром готовился к севу народ!
Своих лошадей запрягая,
Красиво одеты, как в праздничный день,
Отцы шли на плуг налегая.
За ними шли деды, бросая зерно
И матери им помогали,
А вслед сыновья боронили поля
Землёю зерно закрывая!
Мы также пахали с отцом огород.
Картофель на сотках сажая.
Как сеяли раньше он мне рассказал
О детстве своём вспоминая.
Как пни корчевали, и камни убрав,
Для пашни поля расширяли,
Как в детстве, в далёкие те времена,
В трудах цену хлебу познали.

# Вольга Іванова

***

Ёсць на карце Сусвету чароўны куток,
Вераніцынскай зоркай шляхі адчыняе –
Беларускі, утульны, святы Гарадок
Краявідамі-кветкамі дух захапляе.
Вераб'ёваю песняю горы гучаць,
Абдымае паветра сваёй чысцінёю,
Давядзецца камусьці тут шчасце спазнаць
Палюбіць край азёрны ўсёю душою.



# Дар'я Данілава

## Мая вёска

Ганаруся борам, полем, рэчкай,
Што цячэ павольна між кустоў…
Дарагое, любае мястэчка!
Цягнеш да сябе ізноў!
Не пражыць мне без рачулкі, лесу,
Той чаромхі, што цвіце наўкол.
Без чабору, паху кветак, бэзу,
Крапівы-жыгучкі між платоў!
А той дуб-асілак ля дарогі
Не забыць ніколі мне, павер:
Не адной дзяўчыне – людзям многім
Саграваў душу і клікаў на давер.
Вёсачка Вархі зусім малая,
Хоць не хутар, а сяло.

І ўсё ж на свеце ты адзіная такая –
Беларусь прайдзі і ў поперак і ўздоўж.
Усё прыгожа тут і сэрцу міла:
Спевы птушак і гняздо буслоў…
Дзе яшчэ я так была б шчаслiва
У свае чатырнаццаць гадоў?

## Ала Демяншчонак

### Есть деревня в лесу

Есть деревня в лесу
И зовут её люди - Кабище.
Но преданье гласит,
Что царевна деревню ту ищет.
Было время шальное,
Она по Руси проезжала.
И в пути имена та царевна
Всем деревням давала.
Достоверно известно,
Что Вележа как велишь
Писаря записали.
А Кабище ушло из народа,
А она чтоб ещё побывать здесь
Уезжая мечтала.
Так душа и летает
И ищет деревню Кабище.
Кто не верит преданью
Пусть в документах поищет.
Вот она та деревня
Здесь хорошие люди живут
Сеют хлеб, растят деток,
И историю помнят и чтут.

# Ірына Калініна

## Есть на карте уголок

Есть на карте уголок
Под названьем Городок.
Лев на гербе изображен –
Охраняет город он.
Край озерный, край лесной
С самобытною душой.
Мест прекрасных здесь не счесть.
Воробьевы горы есть.
Есть речушка Горожанка
И цветочная полянка.
Кинотеатр и бассейн.
Дом ремесел и музей.
Церковь, школы и костел.
Городок у нас расцвел.
Он вовсю преобразился.
Больше всеми полюбился.
Тихий, скромный, милый город.
Не найти сердечней строк
Будешь ты навеки молод.
Наш любимый Городок.



# Анатоль Ліберaў

## Рожь да пшеница

Берег речушки, тихий, неброский…
В белых халатиках в поле берёзки.
Дуб над завалинкой делает тень,
Старенький дедушка ладит плетень.

Рожь да пшеница, пшеница да рожь –
Что может сердцу быть дороже?
Малая Родина, ты меня ждёшь.
Я по тебе скучаю тоже…

А из избушки на курьих ножках
Радостно песню запела гармошка!
Древняя печка, бабулька с ухватом.
Пахнет укропом и свежим салатом.

Травы–муравушки стежку плетут,
Прямо к калиточке нас приведут.
Матушка с вёдрами ждёт у крыльца,
Слёзы от счастья смахнула с лица…

Я обниму мамуленьку нежно,
Вёдра наполню студёной водой…
Выйдет с гармошкой сосед потешный,
Старый солдат, но душой молодой.

Милая бабка почти ослепла,
Но улыбнётся и скажет вдруг:
- Слушай, Адам, принеси-ка хлеба!
Кажется, в гости приехал внук…

Мы на скамейку к столу присядем,
Вкусную кашу подаст бабуля.
И запоёт гармонь двухрядьем,
Нежную песню затянет мамуля…

Светлая, тихая жизнь у речки,
Пахнет вкуснятиной разной от печки.
Мы приезжали залечивать раны.
Я и дружок мой… После Афгана.

# Галіна Міхайлік

## Посреди большой планеты

Посреди большой планеты
Где рождаются рассветы,
Рек прохладных берега
И туманов пелена,
Есть прекрасная страна
Беларусью названа
Меж бескрайними лесами
И зелёными лугами тут,
Где пташек пенья звуки
Приютились мирно Гурки.
Житель здешний просто «клад»
Добродушен стар и млад.
Ручейком журчат здесь детки –
Древа будущие ветки.
Все друг другу помогают
Праздники все вместе отмечают.
Если пожелают знаний реку,
То идут в библиотеку,
Где пристанище по сути:
И культуры и науки.
Здесь внимание, забота,
Повседневная работа.

## Яўген Паварэха

## Прызнанне ў каханні малой радзіме

Выраз – малая Радзіма – пачуў і запамятаў яшчэ ў маленстве, калі вучыўся ў пачатковай школе. Але ж тады вялікага жадання ўнікаць у яго сэнс не адчуваў – таму гэта словаспалучэнне пэўным чынам не ўсвядоміў, а можа і не разумеў як належна. Ды і не было ў той час ніякага поклічу для гэтага – жылося ў тых мясцінах, дзе нарадзіўся і якімі абмяжоўваўся ўвесь сусвет прывольна, утульна і хораша, як калісьці ў матчынай калысцы – бестурботна, без боязі за сваю будучыню.

Сапраўдную тугу па роднай старонцы, па сваёй Беларусі адчуў тады, калі паклікалі служыць у войска – ахоўваць эстонскае неба. Незабыўна, як з сябрам з горада Орша прыдбалі радыёпрыёмнік "Хазар" і пранеслі на пазіцыю баявога дзяжурства. Мы не збіраліся слухаць замежныя галасы, заўсёды стрэлка шкалы была настроена на беларускі радыёканал.

Родная мова няспынна вабіла, хвалявала сэрца, утульна клалася ў душу, навявала прыемныя, дарагія ўспаміны, думкамі вяртала дадому.

У наступны раз разлука з малой Радзімай доўжылася амаль тры дзесяткі гадоў – была не прымусовай. Так склаліся абставіны, што такі зыход палічыў за лепшае і вельмі хутка жыццё паказала, што памыліўся – зрабіў неразважлівы ўчынак.

Кароткія пабыўкі ў родным куточку не аднаўлялі былых адчуванняў – таго ўтульнага заспакаення, замілавання, усвядомленай упэўненасці, што роднае наваколле, яго прасторы, як і раней, належаць, разам з мясцовымі жыхарамі і табе.

Усё вярталася толькі ў турботных, але прыемных снах, ды ў час чытання кніжак, калі ўяўлялася, што падзеі літаратурнага сюжэту адбываліся, разгортваліся амаль заўсёды ў родных мясцінах – у хатах аднавяскоўцаў ці суседніх паселішчаў, на знаёмых вуліцах і завулках. Мясцовы ручай пераўвасабляўся ў вялікую раку, поле рабілася стэпам, бліжні лес адпавядаў усім дзеянням з кніг.

А яшчэ заўважаеш такую акалічнасць. Знаходзячыся далёка ад малой Радзімы прыгадваеш такія драбніцы з мінулага, якія, здаецца, ніколі не ўспомніў бы калі б жыў тут не вылазна, неадлучна.

У думках зноў і зноў вяртаешся на вуліцы сваёй вёскі, на палявыя і лясныя сцежкі–дарожкі. Як бы ідзеш уздоўж узлескаў, рачулак і ручаёў, стаіш на высокай градзе каля ляснога возера Удзебна ці на пясчанай гары ва ўрочышчы Стайкі. І ўсё адбываецца, як у сапраўднасці.

Зварот дадому быў доўгачаканым, даўно жаданым. Толькі ў нечым крыху сумным, расчараваным.

Калісьці цешыла душу тое, што жыццё тут паступова і неадступна наладжваецца, паляпшаецца. Без маёй прысутнасці вырасла новая цагляная

двухпавярховая школа са спартыўнай залай, у маляўнічым сасновым пералеску здзейснены шыкоўны асфальтаваны калаварот для зручнага развароту маршрутных аўтобусаў.

Але ж я ведаю для чаго тут секлі сосны мае хлопцы, калі я яшчэ працаваў ў саўгасе майстрам будаўніцтва. На гэтым месцы планаваўся шматфункцыянальны гандлёвы цэнтр, але прыйшла славутая перабудова і праглынула тыя задумы. Таксама бачыў я зацверджаныя прывабныя планы далейшага развіцця роднага краю, якія таксама ўшчэнт зруйнавалі новыя паляпшальнікі народнага жыцця.

А як цудоўна ўсё пачыналася калі амаль з нічога ўтварыўся мясцовы – свой – саўгас з маладзёжнай назвай “50 год ВЛКСМ”. Не было трывалай матэрыяльна-тэхнічнай базы, здавальняючага жылля, адміністрацыйна-культурных і іншых неабходных будынкаў. Былі толькі людзі, мясцовыя жыхары, цяпер разумею – сапраўдныя патрыёты сваёй зямлі. Неўзабаве шмат чаго адбудавалі сваімі саўгаснымі сіламі. З вялікімі цяжкасцямі, але з яшчэ большым энтузіязмам. Ды і як інакш, калі з двух з паловай соцен працаўнікоў каля васьмідзесяці былі камсамольскага ўзросту.

Давялі да ладу клуб - куды часова размясцілі і кантору саўгаса – які пры былых гаспадарах пяцігодку макрэў без даху. Узвялі цагляны двухпавярховы прыгажун – дзіцячы садок, які сёння пустымі глазніцамі вялікіх вокнаў з дакорам глядзіць у новую сучаснасць. Пабудавалі адміністрацыйны будынак – цяпер пустуе – з почтай і тэлефоннай станцыяй, некалькі вуліц жылля сядзібнага тыпу.

Паступова з’явілася добрая збожжасушыльная гаспадарка, цудоўныя механічныя майстэрні, прыбытковы жывёлагадоўчы комплекс, кармацэх, лесапілка і шмат іншага.

Гэта болей чым крыўдна, калі дзеля аднахвіліннай выгоды, з-за часовых цяжкасцей бяздумна рушыцца самаадданая праца некалькіх пакаленняў, якая б у недалёкім будучым прынесла б зашмат карысці, але новыя гаспадары не здолелі вытрываць ліхалецця і знішчылі ўселякую перспектыву далейшага росквіту роднага краю.

Але жыццё прадаўжаецца. Што было, што магло быць, толькі не здарылася – ужо не вернеш, не направіш. Трэба задавальняцца тым, што засталося, што ёсць цяпер. Перш за ўсё захаваўся чароўны прыродны куток вёскі Кабішча. Пабываўшы за сваё жыццё шмат дзе ўпэўнены, што нідзе не бачыў такога хараства, якое ёсць у нас – каб вёска, падзеленая рэчкай Кабішчанкай з высокімі берагамі на дзве паловы, абдымалася са звонкім сасновым пралескам. Яны пераплецены доўгай чарадой уласных хат, цаглянымі павярховымі шматкватэрнымі дамамі, тымі ж – клубам, адміністрацыйным будынкам почты і АТС па дзівосна звілістым узлеску. А ў самым сасняку прытуліліся былыя – прыгажун-садок, красуня-школа, а таксама выдатны аўтобусны прыпынак. Тут жа і скрыжаванне дарог. З глыбіні лесу прабягае цэнтральны шлях – сувязь з навакольным сусветам, а тры другія дарогі разыходзяцца па ўзлессі – вядуць у розныя куткі роднага краю.

Да канца 60-х гадоў мінулага веку побач з гэтымі ростанямі стаяў старэнькі драўляны клуб, зроблены з перавезенай сюды сялянскай хаты з суседняй вёскі, пасля тага як згарэў вялізны будынак сельскага савета, клуба, багатай бібліятэкі, ФАПа, почты (побач з цяперашнім ФАПам). Пад стромкімі соснамі і начным зорным небам у вершалінах тут шмат год адпачывала мясцовая моладзь, а ў вясну 1967 года паміж гэтым клубам і былой, яшчэ драўлянай, школай камсамольцы за суботнік і нядзельнік выкапалі траншэі для новага будынка культуры. Але ўвосень будоўлю перанеслі на той ўзлесак, дзе клуб і цяпер. Па абрысу і памерам гэта быў адзін і той жа праект. Тады казалі, што хтосьці з пільных кіраўнікоў угледзіў нешта недапушчальнае ў блізкім суседстве такіз "розных" устаноў.
Яшчэ ў гэтым лесе за старой школай шматлікія дарожыны як бы ўтваралі сваімі перакрыжаваннямі вялікі круг даўжынёй у два кіламетры, які настаўнікі фізкультуры выкарыстоўвалі лыжнёй ўзімку і для кросаў у астатні час. Цяпер спляценні тых дарожак зарастаюць хмызнякамі. У тую драўляную школку я бегаў восем год з суседняй вёскі Сюбараўка, за якой пачынаюцца вялікія лясныя прасторы да самых сучасных межаў з Расіяй – былы партызанскі край.
Дарэчы толькі ў мінулым годзе – 26 снежня – у дзень 75-годдзя вызвалення Кабішча ад нямецкай навалы, я даведаўся, што Сюбараўка была ачышчана ад ворага яшчэ 22 снежня. Чатыры дні на адлегласці паўтара кіламетра тут стаяў пэўны ўчастак вялізарнага фронту! Тут, дзе я дасканала ведаю кожны ўзгорачак, лагчынку, кожны куточак! Чамусьці ў школе аб гэтым нам не казалі.
У пачатку шасцідзесятых гадоў, калі я вучыўся ў другім класе то атрымаў заданне: "Падлічыць колькасць хат нашай вёсцы". А вучань чацвёртага Аверчанка Уладзімір – колькасць жыхароў. (Адзін настаўнік, Паліна Малахаўна Сініцына, адначасова ў адным памяшканні навучала два класы). Я налічыў сорак адзін, а жыхароў было 154 ці 156. Сёння там жыве адна састарэлая жанчына – Бендзікава Раіса Рыгораўна.
З юнацтва памятаю аповед старажыла вёскі – Бастава Барыса Васільевіча аб яго гісторыі.
Да калектывізацыі Сюбараўка мела адну вуліцу ў напрамку суседняга Кабішча і была вёскай беднякоў. За рачулкай Ныркай, улева ад мосту, жылі заможныя Вальнякі, таксама ў адну вулку ў некалькі хат. Новае паселішча, куда павінны былі звесці з навакольных вёсачак і хутароў аднаасобнікаў, вызначылі ўздоўж галоўнай прамой дарогі паміж Евінам і Кабішчам. (Цяпер яе няма – знішчылі меліяратары). Туды нават перасялілі некалькі гаспадарак, але немцы, калі адступалі ўвосень - зіму 1943 года спалілі іх). У ўсё ж узбуйненай вёскі там не адбылася. Хітруны Вальнякоўцы адарылі і напаілі землямераў і новае паселішча "пасадзілі" ў гразнае, гліністае месца паміж і вакол Вальнякоў і першароднай Сюбараўкі. Новая вёска атрымалася няграбнай, з мудрачелістым размяшчэннем вуліц і завулкаў, якая сярод жыхароў набылі вычварныя прозвы.

Звезеныя гаспадаркі, што пасялілі насупраць Вальнякоў, празвалі Прытычка. Вуліцу ад ростаняў у бок абагульненага жывёльнага двара – за якім і планавалася новая вёска – так і назвалі – Абагульная. Невядома толькі чаму гнутая, як клюка вуліца ў напрамку Евіна стала Грыбатай. Былі і два завулкі – Сабалі ці Сабалішкі і Максімава або Чуева вотчына.

Паселішча прыдбала агульную назву – Сюбараўка, але да апошняга часу ў выбарчым спісе было дзве вёскі. На сюбараўскім беразе вуліцы склаліся ў выглядзе крыжа, на Вальнякоўскім, як звілістая рагаціна ці закручаныя вусы. Да 1956 года Сюбараўка была калгасам імя Варашылава, а потым, як і ўсе навакольныя вёскі-калгасы, увайшла ў склад саўгаса “Гарадоцкі”.

Яшчэ трэба сказаць пра крыніцу-ключ, што б’е пад узгоркам каля маста. Яна ніколі не замярзае зімой. У вялікія маразы над зрубам уздымалася пара, а ўлетку ад крышталёвай вады “ламіла” зубы, але ніхто ад яе не хварэў на ангіну.

З усіх куткоў раскіданай па пагорках вёскі сюды напрасткі хадзілі па воду з вёдрамі на карамыслах. З гэтай нагоды ўтварыліся шматлівыя сцежкі. Я памятаю, бадай, усе вясковыя сцяжынкі – не толькі да крыніцы – незлічона колькі бегаў па іх у дзяцінстве.

Ніколі ўжо летнім ранкам тут не заспяваюць пеўні, не пачуць мяншавання кос, званочкаў дзіцячых галасоў. Адвячорам статак кароў не ўздыме воблакі пылу па вуліцах, не перагукнуцца цераз плот суседзі. У звонкую зімовую раніцу не ўздымуцца дымы над комінамі, ніхто не пракладзе следу на свежым снезе вуліц, не заскрыпяць дрэвам “журавы” калодзежаў і палазы саняў з прыглушаным конскім тупатам. Некаму ўжо ў марозныя ночы глядзець у зорнае неба, якое бывае толькі над маёй Сюбараўкай.

Але як бы не было, невядомая сіла кожны раз цягне на тое месца, дзе нарадзіўся, дзе твая малая Радзіма. Няхай заўсёды так і будзе.

## Алеся Папова

### Зямля мая

Прекрасна ты, моя земля,
В своем величии достойном,
Где реки – отблеск хрусталя
И лес – в молчании спокойном.

Земля моя, мой край родной –
Начало жизненной дороги.
Здесь было все: жара и зной,
Печали, радости, тревоги.

Светлеет небо голубое,
И сердце рвется вновь к тебе…
Земля моя, я вновь с тобою,
В печали, в радости, в беде.

## Таццяна Паўлоўская

### Кут бацькоў

Кут бацькоў, зямля маленства,
Хатка на краю сяла.
У чым знайсці вам падабенства?
Што мне доля тут дала?
Можа, у ветрыку-вятрыску,
У бярозавым галлі
Ён люляў маю калыску
Ажно з ранку да зары?
Можа,у пахкім кусце бэзу?
Што пад вокнамі расцвіў
Ці ў бялюткім мяккім снезе,-
Вунь, ён двор увесь пакрыў.
Мабыць, з ласкай маёй маці-
Вось упадобіліся ў чым.
Яна часта ў гэтай хаце
Шыла вопратку ўсім.
Азярцо вадой празрыстай

У сябе зоркі ўзяло.
Астравок кружком урачыста
Паглядае на сяло.
У азёрнай ціхай плыні
Лодка гойнецца ў начы.
Дык дабаў жа, Божа, сілы
Гэты край мне зберагчы!

## Мой край

Вёска мая, край бацькоў і дзядоў,
Блеск купальскіх агнёў, шэпт ліпнівых бароў.
Шэлест траў лугавых, клёкат летніх буслоў,
Мая родная вёска – край бацькоў і дзядоў.
Мая родная хатка на ўскрайку сяла.
Ты мяне да жыцця праз гады правяла.
У тваіх сценах мне песню матуля пяе,
Я да скону гадоў чую голас яе.
У парку вузкая сцежка яе рэчкі плыве,
З поўнага русла збівае крынічка яе.
З клёнаў алея расце навакол,
Мая родная вёска – родны край здавён.

# Наталля Саветная

## Горожанка

Городок-уснувший город-
Не тревожат каблучки.
И тропинка на пригорке
Затаилась и молчит.
Горожанка-речка вьется
Меж холмистых берегов.
Распустила ночка косы,
Звезд набросила покров.
Дремлют старенькие чёлны,
Травы тихо льнут к ногам.
Час свиданья, неги полный,
Нам судьбой сегодня дан.
Каждый шорох, всплеск водицы
Это звук твоих шагов…

Серебром луна искрится
Меж холмистых берегов.
Ты придёшь – тебя, родную,
Жаркой лаской одарю,
Зацелую, замилую
Горожаночку мою!

## Городок/Гарадок

Городок, мой город светлый –
Детства ласковые дни!
Как и прежде, ты приветлив –
Дом большой моей родни.
Каждый – брат как будто кровный:
Нараспашку добрый взгляд!
И вдоль улиц строем ровным
Вехи памяти стоят…
Городок, мой город светлый –
Белый – даже в час ночной!
Ловко кружевные петли
Вяжет снег-мастеровой.
Палантином кроет плечи,
Под ногами – нежный пух…
Непорочно юн и вечен
Белый-белый родны дух.

Гарадок, мой горад светлы –
Бесклапотныя дзянькі!
Ты ласкавы і прыветны –
Тут сябры і сваякі.
Усміхнецца шчыра кожны
І сястрою назаве.
А на вуліцах прыгожых
Раптам памяць ажыве.
Гарадок, мой горад светлы. –
Белы ён і ў цёмны час!
Вось, карункавыя петлі
Майстар-снег пляце для нас.
Палантын прылёг на плечы.
Каля ног – пяшчотны пух…
Ён бязгрэшны, юны, вечны –
Белы-белы родны дух!

## Град-Городок

Мой город тих и неприметен,
Названьем скромен – Городок,
Стоит, как в сказочном завете,
На перепутье трёх дорог.
Свернёшь на запад, быть женатым –
Там земли девицы-Литвы.
На юг поедешь – быть богатым,
Коль Соловья минуешь ты.
А ляжет путь на север дивный,
Готовься тяжкий крест нести:
Тебе огонь и холод-ливни,
И трубы медные пройти.
Дойдёшь и обретёшь всё сразу:
Жену и брата, хлеб и кров,
Защиту от дурного глаза
И Богородицы покров!
Град-Городок – сердечко дружбы,
Его толчки в моей груди.
Петровым камнем Богу служит,
С какого боку ни гляди!

## Мой Городок

С великих возвращаясь городов,
Я наслаждаюсь ласковостью улиц,
Мелодией знакомых голосов,
Небесным светом лиц родных любуюсь…
Милейший, лучезарно-тихий город –
Мой Городок!
О, как ты сердцу дорог!
Здесь можно окна настежь распахнуть,
Петь вместе с соловьём без фонограммы,
И только тут благословит мой путь
И защитит от бед святая мама.
Спешу навстречу к ней по травам отчим –
Да не разделят нас ни дни, ни ночи!
А в дом, кружась, влетает яблонь цвет.
Чирикает в ветвях знакомец старый.
И словно не было прошедших лет –
Всевластны над душою детства чары…
О, как же ты любим и сердцу дорог,

Мой Городок – ты лучший в мире город!

## Снегопад

Не узнать любимый город:
Снéга,Снéга,Снéга — горы!
Экскаватор и бульдозер
Их сдвигают, грузят, возят…
Лабиринты меж сугробов
Ловких жалуют особо.
Здесь машины не проскочат.
Над собой народ хохочет –
Тонет, падает и вязнет…
Хорошо – в снегу, не в грязи.
А в барханах, мыши словно,
Дети роют, роют норы,
Строят крепости и башни,
Будто я – во дне вчерашнем,
Дне далёком и счастливом…
Мир вокруг, как в детстве, – диво!
Не узнать любимый город:
Смеха, Смеха, Смеха – горы!

# Наталля Уласава

## Край мой родны

Край мой родны
Гарадоччынай завецца.
Назаўсёды ў сэрцы,
У думках застаецца.
І куды б не ехала,
У памяці , як здымкі….
Плошча, паркі, башня….
Мільгаюць карцінкі.

А на здымках гэтых
Усё для сэрца міла.
Тут я нарадзілася,
Тут жыцце пражыла.

## Пашчасціла

Беларусь мая зорамі ўкрытая.
У ёй блакітаў азёр хараство.
Шум гаёў,што крыніцамі ўмытыя,
Палёў жытніх і льну бажаство.

Людзі нашы  старанны і ветлівы,
Працавіты, адкрыты душой.
Беларусь нас расціла малітвамі,
Як магла, берагла талент свой.

Прынімаць у нас умеюць гасцінна:
Тут прысмакі і бульбы з гарой!
І няма, для нас, лепей краіны,
І не знойдзеш, нідзе ты такой!

Бусел кружыць над роднымі хатамі
Адчувае лагоду, пакой.
Дом чакае нас , можам быць ўпартымі.
Нам пашчасліла , дружа, з табой!

## Срэбрам бруіцца

Срэбрам бруіцца
Мая Гаражанка.
Чым я не Аленка,
А ты не Іванка?
І зноў каля рэчкі
Стаім я і ты,
Каб там мілавацца
Ля чыстай вады.
І птушкі злятаюцца
З выраю улетку.
Быццам да маці,
Злятаюцца дзеткі.
Качкі ля рэчкі
Кружаць карагод.
Чакаюць калі
Іх пакорміць народ.
Спынісь, неспяшайся.
Хвілінку пастой…
І подых адчуеш

Радзімы сваёй.

## Усміхаецца неба

Усміхаецца неба
У родных мясцінах.
Я не ўбачу такога
У далёкіх краінах.

Краявіды чаруюць,
Чысты людзі душою.
Гарадок, як матуля,
Назаўсёды са мною.

Скора вырасту… стану
Я вялікім і мужным,
А Радзіма мая
Будзе крэпнуць і дужыць!

## Я даўно жыву далёка

Я даўно жыву далёка,
А у сэрцы…
Буслаў клёкат.
І блакіт
Ад поля лёну,
І гушчар
Лясоў зялёных.
Спевы птушак,
Грукат грому…
Мне з дзяцінства
Так знаёмы.
Кралі з зорак нанізаю
Я на нітачку даўгую.
Быццам шлях
Складу да месца
Дзе лагоду
Зноў адчую.
Я даўно жыву далёка.
Але ў думках, а ні разу,
Не забыла Беларусі
Дарагія мне мясціны.

# Святлана Цмугунова

## Гарадок

Мая маленькая радзіма,
Ізноў з табой сустрэлась я,
Дзе засталась мая сям'я,
Зямля, дзе маці нарадзіла.

Мінуўшчына адсюль званіць,
Няхай я толькі прыхаджанка,
Срабрыстай змейкай Гаражанка
На схіле дзённа гаманіць.

І горад на гары стаіць,
Яго акутваюць аблокі,
Маленства дзіўныя вытокі,
Па вам душа ізноў баліць.

Сасновы бор, бяроз узлескі,
Птушыны гоман, вечны зоў,
І першай раніцы пралескі,
Вясна мая, мая любоў…

Ад сэрца не адвесць журбы,
Брыду, мо тая парыжанка,
Няхай я толькі прыхаджанка,
Я – катаржанка назаўжды.

## Даўгаполле

Колькі вёсак, пасёлкаў, мястэчак…
Назваў сотні, здзівіцеся вы.
Ля дарог, ля азёраў, ля рэчак
Спачываюць, мо скарб векавы.

Кожнай ты надарыла аблічча
З асабістасцю рысаў, зямля,
Гэта, што Даўгаполлем мы клічам,
Стала нам, чужакам, як свая.

Знакаміта сваімі байцамі,
Гістарычнасцю звестак, шляхоў,
Жыхароў дабрачынных – сарцамі,
Мудрай думкаю сталых айцоў.

І вакол, праўда, поле ды поле,
Толькі колер мяняе штогод,
Але, хай бы жыло Даўгаполле
Яшчэ многа і многае год.

## Песня аб Радзіме

На сэрцы кружацца віры:
Палі, лясы і рэк журчанне,
І пах смалісты ў бары,
І кветак чэрвеньскіх каханне.

Нябёс бязмежных глыбіня,
І цеплыня вандроўнай сцежкі,
І лёгкіх матылькоў гульня,
І прыгажосць тваёй усмешкі.

Асот густы ля беражкоў,
На ножцы тоўсценькай у глеі,
Нібыта з тысячы шматкоў
Пашыты жоўтыя лілеі.

Жыві, Радзіма, і спявай,
З табой душа так прагне зліцца,
Пакуль што думка будзе біцца,
Я буду славіць Родны Край.

## Шчыры край мой

Шчыры край мой, народ клапатлівы,
Край бясконцых ялін і бяроз,
Бераг рэчкі, узгоркі і нівы,
Дзе з дзяцінства вучыўся і рос.

Дзе бацькоўская родная хата,
Дзе адвеку зямельку араў,
Дзе блакітных азёраў багата,
Не загублены ворагам край.

Край гаворкі і думкі сумленнай,
З дзіўнай казкі былінных слядоў,
Будзь жа ты назаўжды благаслаўлёнай,
Мова прадзедаў і дзядоў.

Я цябе берагчы абяцаю
Не адзіны яшчэ гадок,
Поўжыцця аддаю-прысвячаю
За хвіліны балючы радок.

### Я сумую па роднай старонке

Я сумую па роднай старонке,
Па зямле, дзе бярозкі растуць,
Птушак дзе не сціхаюць гамонкі,
Дзе вясною саловачку чуць.

Я сумую па жытнему полю,
Па абшару сваіх васількоў,
Не дарэмна Радзіма святою
Называецца сконцу вякоў.

Ты мая мілая, сіняя, шызакрылая,
Ты мая спадчына, песнь бусліная, казка матчына.

Я сустрэчы з табою чакаю,
Колькі ветлівых знойдзена слоў,
Краю родны, напэўны мой краю,
Мне малюнкам з’яўляецца зноў.

Там лясочак стаіць за ракою,
Там званочкі гудуць ад вятроў,
Не дарэмна Радзіма святою
Называецца сконцу вякоў.

Ты мая мілая, мая сіняя, шызакрылая,
Ты мая спадчына, песнь бусліная, казка матчына.

## Легенды і паданні Вышадскай зямлі

### Чортаў мост

Ёсць за вёскай Бярозна ручаінка. Якое б сухое лета ні было, а тут заўсёды гразь, заўсёды мокра - чортавым мастом называюць. Цяпер дарогу зрабілі новую, дык аж з другога канца вёскі, каб чортаў мост пакінуць у баку.

Кажуць, некалі ў кожнай вёсцы сялілася чарцяня. З хлопцамі на пасядзелкі да дзевак разам хадзіла, разам шуткавала з імі: то ў якой клубок нітак закоціць у самы цёмны вугал, то зблытае іх, то нітку пачне рваць у прахі, то шнур

скідваць у пралцы... Спачатку смяяліся ўсе з яго выбрыкаў. А потым ён пачаў дужэй сваволіць ды ўжо так раздурыўся, што і ўнёму яму няма. То салому на крышах уздыме, то ў дзевак выхапіць пляцёнку з бялізнай з рук ды і штурне ў пясок...

Ды быў у вёсцы мужык - сталы такі чалавек. Пачаў чорт сваволщь і з ім. Паехаў гэты мужык у лес па дровы (зімой гэта было). Накладвае дровы на сані, а чорт каня ціхенька распрог, ды і хіхікае за дрэвам. Пакуль мужык каня запрог, чорт дровы раскідаў. І так ён здзекаваўся з чалавека аж да ночы. Раззлаваўся мужык: "Ну кажа, чорт ты гэтакі, я табе пакажу!"

Выехаў з лесу, а чорт наперад і давай снег кідаць. Аж завіруха ўзнялася. Конь ішоў - ды і стаў - сілы не хапіла, бо ўвяз у вялізную гурбу. Як ні біўся чалавек, а каня ніяк не выцягнуць. Пашыбаваў чалавек у вёску, каб папрасіць у людзей дапамогі. Хлопцы ўжо збіраліся на вячоркі, але так і рушылі гурбой да лесу. Яны, па праўдзе кажучы, даўно заўважылі, што ля лесу чамусьці віхурыць. Адкапалі каня, прыехалі дадому і вырашылі чорта выгнаць з вёскі.

Заманілі яго хлопцы на распісныя сані, запрэглі ды і давай паганяць, гікаць. Чорт ужо і стаміўся: і так гляне, і гэтак папросіцца. А яны нібы не чуюць - паганяюць яго ды і усё тут. Даехалі да ручаіны, чорт зусім знямогся, - гэцкнуўся ў ручэй. Адзін кажа:

- Ну і заставайся тут, чарцяка, будзеш замест мосту на гэтай ручаіне! - ды і перахрысціўся. Чорт як заенчыць. А хлопцы - кожны крыж на сябе, на вёску, на поле, на лес.

А чорт, бачна, там і застаўся ці мо збег, а сюды калі-некалі з'яўляецца, пасваволіць, паздзекуецца з людзей. Бывае, людзі збяруцца: пажар недзе блізка за ручаём. І так палыхае, глядзі зараз у вёску прыйдзе. Пабягуць туды - усё знікне. Нідзе нічога няма.

Вярталася аднойчы моладзь з вяселля дадому, у Сюбары ішлі. Падыходзяць да мосту, адкуль тупат конскі, насустрач ім парка каней у вялізную карэту запрэжанае імчыць, што ёсць духу. Моладзь убок адскочыла - толькі коні гразёю іх абкідалі. Адна дзяўчына напужалася і давай хрысціцца. І ні коней, ні тупату - вакол цішыня. Куды што падзелася...

**Запісана ад Марозавай Марфы Іванаўны Аболінай Л. П.**

## Знікшае возера

На ўсходзе ад вёскі Вышадкі, у самым лесе, налева ад дарогі, можна і зараз убачыць контуры невялікага возера. Кажуць, у даўнія гады яно нагадвала люстэрка - такое было чысцюткае ды светлае, нягледзячы на тое, што было ў лесе і ніякіх рэчак туды не ўпадала. Па самым беразе возера пралягала дарога. І людзі па ёй хадзілі, і прыгожыя карэты панічоў раскатваліся. У мясцовага пана была дачка - ды такая прыгожая. Кахала яна хлопца, што рабіў у панскім двары. Быў ён вясёлы і лагодны чалавек. Чым больш разгаралася іх каханне, тым больш разгаралася жаданне пана-бацькі выдаць дачку за самага багатага паніча. Каго толькі не бачыла панская зала... А паненцы ўсё было не так, усё не давала згоду, бо ў кожным нейкую загану бачыла.

Надакучылі бацьку-пану дочкіны капрызы і загадаў ён дачцэ надзець вясельны ўбор і ісці на шлях ды сустрэць нарачонага - багатага старога, які вёз сваёй нявесце цэлую карэту скарбаў у падарунак.

Выйшла бедалажка ў бялюткім уборы ў лес, а тварык яшчэ бялейшы! Паднялася на курган, што над возерам, ды так і змярцвела ў чаканні свайго лёсу на супрацеглым беразе возера. Раптам падняўся грукат, узмыленыя коні паказаліся на дарозе. А тут ці возніца заглядзеўся на паненку, ці то яе скаргі дайшлі да Бога - як імчаліся коні па шляху, так і сіганулі ў возера. Ні карэты, ні скарбаў, ні старога пана-жаніха.

Толькі кругі разышліся над вадой. З таго часу замуцілася возера, стала мялець і зусім знікла.

А паненка?.. Паненка прапала. Ніхто яе больш не бачыў. Хто кажа "збегла з дому", а хто "бярозкай стала на беразе".

**Запісана ад Сіваковай Соф'і Іванауны Аболінай Л. П.**